# Асаблівасці беларускага нацыянальнага касцюма

УА "Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт"
***Вярышка Г.С., 1 к., 3 гр., ЛФ***
Кафедра рускай і беларускай моў
Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык *Варанец В.І.*

Беларускае народнае адзенне фарміравалася на працягу стагоддзяў. Але асноўныя яго віды і састаўныя часткі, спосабы пашыву і кампазіцыйныя рашэнні, каларыстычныя і арнаментальныя асаблівасці пачалі складвацца з канца XIII ст. адначасова з фарміраваннем беларускай народнасці. Касцюм беларусаў развіваўся ў кантакце з касцюмамі рускіх, украінцаў, а таксама літоўцаў, палякаў, іншых народаў, і поруч са сваімі нацыянальнымі рысамі ён узбагачаўся іншанацыянальнымі.

Тыповымі рэчамі мужчынскага касцюма з'яўляюцца доўгая, амаль да каленяў, кашуля і штаны з даматканага палатна натуральнага (белага) колеру. Галаўны бор – валеная з воўны або пашытая з сукна шапка (магерка), у зімовую сцюжу – вушанка (аблавуха) з аўчыны; асноўны абутак – лапці, часцей лыкавыя, больш заможныя па святах насілі скураныя боты.

Асаблівасцю беларускага мужчынскага касцюма з'яўляеццат ое, што кашулю носяць навыпуск паверх штаноў, пад пояс.

Кашуля (сарочка) – самы старажытны і ўстойлівы элемент у традыцыйным народным касцюме. У найбольш старажытным варыянце яна мела тунікападобны крой, доўгія, нярэдка ніжэй кісці, рукавы і прамы разрэз варата.Але паміж словамі «сарочка» і «кашуля» ў старабеларускай мове існавалі семантычныя адрозненні. «Сарочкай» звычайна называлася ніжняя нацельная рубаха, а верхняя, якую апраналі на ніжнюю, – «кашуляй».

Штаны (нагавіцы, ганавіцы, порткі, парткі) шылі з грубага палатна, а таксама мелі янывузкія калашаны ("штаны з вузкім шагам"). Назва штаноў «ногавицы» («нагавицы») мае старажытнарускае паходжанне і сустракаецца у актавыхматэрыялах XV—XVI стст.

У зімовы час паверх іх надзявалі штаны з даматканага сукна шэрага колеру (суконнікі). Кішэняў у іх не было, а неабходныя ў паўсядзенным ужытку рэчы (крэсіва, люлька, нож і інш.) насілі ў скураной сумцы (шабета, каліта) або падвешвалі непасрэдна да пояса.

Вельмі важную ролю у беларускім нацыянальным адзенні адыгрываюць паясы. Яны з'яўляюцца неабходным элементам як і ў жаночым, так і ў мужчынскім касцюме.

Іх даравала нявеста свайму выбранніку напярэдадні і ў час вяселля, іх бралі з сабой, ідучы ў адведкі да парадзіхі, іміспавівалі нованароджаных і гадавалых дзяцей, іх ахвяравалі царкве, яны выкарыстоўваліся як рытуальныя атрыбуты ў час гаданняў, замоў, заклінанняў.

Паясы вызначаліся вялікай разнастайнасцю, адрозніваючыся сваімі



Репозиторий ГрГМУ

памерамі, наяўнасцю дадатковых дэталяў, узорным арнаментам, спосабам вырабу.

Найбольш распаўсюджаным і характэрным верхнім адзеннем былі суконная світа (сярмяга, латуха, сукмана, катанка) і аўчынны кажух (футра, шуба). Па свайму крою і колеру світы былі неаднолькавыя, утвараючы на тэрыторыі Беларусі некальківарыянтаў.

Цікавым з'яўляецца тое, что кожны селянін меў дзве світы: паўсядзенную і выхадную. А таксама шмат мог казаць колер світы, які залежыць ад функцыянальнага прызначэння світы, сацыяльнага адрасата і раёна бытавання.

Зімою выкарастоўвалі кажухі або футравыя шубы. Кажух – доўгая верхняя вопратка з вырабленых аўчын. Кажухі, па свайму крою, не адрозніваліся ад світ. Насілі іх і жанчыны і мужчыны. Адрозненнем мужчынскага і жаночага кажухоў з'яўляецца тое, што жаночыя дэкаруюцца вышыўкай і аплікацыяй.

Выдзяляюць таксама такі падвід адзення як шляхецкае. Сюды будзе адносіцца капот, жупан, кунтуш, дэлія. Капот уяўляў сабой прыталены кафтан на гузіках, які шыўся з тонкага шэрага сукна. Жупан – больш доўгі кафтан, крыху прыталены, са стаячым каўняром; яго шылі са светлага ці шэрага сукна, радзей – атласу ці аксаміту. Жупаны падпярэзваліся скуранымі, суконнымі, шаўковымі паясамі. Спінку ў іх рабілі прыталенай, полы суцэльнымі. З бакоў устаўлялі кліны. Ззаду па таліі жупаны моцна прызборвалі або закладалі ў складкі. Жупан падпаясваўся поясам, які надаваў яму святочную ўрачыстасць і нацыянальную вызначанасць. З гэтай мэтай ужываліся знакамітыя слуцкія паясы.

## Тапонімы ваколіц вёскі Мікалаеўшчына

УА "Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт"
***Каранеўская К.А., 2 к, 242 гр., ПФ***
Кафедра рускай і беларускай моў
Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык *Ратынская Н.В.*

У спадчыну ад мінулых пакаленняў нам засталася велізарная колькасць назваў населеных пунктаў, рэк і азёр, палёў і сенажацяў, урочышчаў і іншых геаграфічных аб'ектаў. На зямлі нашай Бацькаўшчыны, бадай, не знойдзеш аніводнай народнай назвы, якая б узнікла выпадкова, без прычыны. І калі ўважліва прыгледзецца, дык заўсёды вызначыш, што вынікае яна з нейкіх асаблівасцей прыроднага асяроддзя, умоў вытворчай дзейнасці жыхароў і вельмі часта звязана з гістарычным мінулым чалавека.



Репозиторий БГМУ